**СТРАТА**

# ПАМЯЦІ ВЫДАТНЫХ ПЕДАГОГАЎ І НАВУКОЎЦАЎ

Напрыканцы сакавіка не стала прафесара кафедры гісторыі і культурнай спадчыны факультэта гуманітарыстыкі і моўных камунікацый, доктара гістарычных навук, прафесара **Івана Уладзіміравіча МАНДРЫКА.**

Іван Уладзіміравіч нарадзіўся ў 1941 годзе у в. Пасад Багушэўскага (цяпер Сенненскага) раёна Віцебскай вобласці. Працаваў токарам на Віцебскім заводзе электравымяральных прыбораў (1959–1964). Скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры (1967), Мінскую вышэйшую партыйную школу (1973), аспірантуру пры Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце (1982). З 1965 года працаваў сакратаром Чыгуначнага райкама ЛКСМБ г. Віцебска, затым загадчыкам аддзела Чыгуначнага райкама КПБ г. Віцебска, інструктарам Віцебскага абкама КПБ. З 1983 года – сакратаром парткама ВДПІ імя С.М. Кірава, дзе неўзабаве пачаў выкладаць.

Менавіта Іван Уладзіміравіч стаў стваральнікам і першым дырэктарам (1994–2009) Віцебскага філіяла Міжнароднага інстытута працоўных і сацыяльных адносін (сёння – Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО»). З 2010 года працаваў у ВДУ імя П.М. Машэрава прафесарам кафедры гісторыі Беларусі (з верасня 2020 года – гісторыі і культурнай спадчыны).

Іван Уладзіміравіч быў вядомым у Беларусі навукоўцам. У 1982 годзе ён абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 2004 – доктарскую. У 2005 годзе яму было прысвоена вучонае званне прафесара. Даследаваў палітычную гісторыю Беларусі, гісторыю КПБ, дзейнасць працоўных калектываў і развіццё чыгуначнага транспарту ў 1960 – 1990-я гады, гісторыю і практыку прафсаюзнага руху і інш.



Іван Уладзіміравіч апублікаваў каля 200 навуковых артыкулаў, з'яўляўся кіраўніком заданняў у межах Дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў, актыўным удзельнікам міжнародных навуковых канферэнцый, членам рэдакцыйнай калегіі зборніка «Ученые записки УО «ВГУ имени П.М. Машерова»».

Іван Уладзіміравіч да апошніх дзён жыцця займаў актыўную грамадзянскую пазіцыю. выступаў перад працоўнымі калектывамі па гістарычных праблемах, друкаваў артыкулы на старонках перыядычнага друку, браў удзел у круглых сталах. Прафесар быў строгім і справядлівым выкладчыкам, мудрым настаўнікам для маладых педагогаў.

Іван Мандрык быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, з'яўляўся лаўрэатам прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Ён быў добрым мужам, бацькам, дзедам.

Прафесар застанецца ў памяці тых, хто яго ведаў, аддавным патрыётам Бацькаўшчыны, таленавітым даследчыкам, прынцыповым выкладчыкам, чалавекам, які вельмі любіў жыццё, працу, людзей.

**Калектыў кафедры гісторыі і культурнай спадчыны.**

12 красавіка перастала біцца сэрца загадчыка кафедры беларускага мовазнаўства, кандыдата філалагічных навук, дацэнта **Генадзя Антонавіча АРЦЯМЁНКА.**

Генадзь Антонавіч нарадзіўся ў 1960 годзе ў вёсцы Кадлубішчы Докшыцкага р-на Віцебскай вобласці. Ва ўніверсітэце (раней – Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя С.М. Кірава) пачаў працаваць з кастрычніка 1981 года пасля заканчэння філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1986-м паспяхова скончыў аспірантуру БДУ. У 1988 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю. У 1993-м Генадзю Антонавічу было прысвоена вучонае званне дацэнта.

Генадзь Антонавіч узначальваў кафедру беларускага мовазнаўства з кастрычніка 2000 года. Абавязкі загадчыка кафедры выконваў на высокім арганізацыйным, навуковым і прафесійным узроўні. Гэта быў адказны, кампетэнтны кіраўнік. Высокаэрудзіраваны ў галіне агульнай лінгвістыкі і беларусазнаўства, ён добра ведаў найноўшыя дасягненні філалагічнай навукі, якімі шчодра дзяліўся з калегамі і студэнтамі.

Генадзь Антонавіч плённа займаўся навукова-даследчай дзейнасцю, на працягу 15 гадоў кіраваў навукова-даследчымі тэмамі кафедры Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў, навуковым аўтарскім калектывам унікальнага лексікаграфічнага выдання «Рэспубліка Беларусь: Лінгвакраіназнаўчы слоўнік», з'яўляўся ініцыятарам стварэння «Рэгіянальнага слоўніка Віцебшчыны».

Генадзь Антонавіч шмат увагі ўдзяляў працы з настаўнікамі і вучнямі Віцебскай вобласці, карыстаўся ў іх заслужанай павагай і аўтарытэтам.



Вылучаўся ініцыятыўным, творчым падыходам да справы і арганізатарскімі здольнасцямі. Быў шчырым і спагадлівым да калег, мог знайсці індывідуальны падыход да кожнага, з кім меў стасункі. Яго любілі і паважалі студэнты, захапляліся яго дасведчанасцю і чалавечнасцю.

Да апошніх дзён жыцця Генадзь Антонавіч займаў актыўную жыццёвую пазіцыю. Ён неаднаразова ўзнагароджваўся дыпломамі, граматамі і ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, Віцебскага гарвыканкама, упраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама, ВДУ імя П.М. Машэрава.

У 2009 годзе атрымаў нагрудны знак «Выдатнік адукацыі». Генадзь Антонавіч быў добрым мужам і аўтарытэтным бацькам, шчырым, прыязным і сумленным чалавекам.

Мы будзем памятаць яго кампетэнтным даследчыкам, інтэлігентным, мудрым кіраўніком, дасведчаным выкладчыкам, светлым чалавекам.

Вечная памяць!

**Калектыў кафедры беларускага мовазнаўства.**


МЫ І ЧАС
Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі 27.10.2009 г. Рэг. № 747.

ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА»

Адрас рэдакцыі: 210038, г. Віцебск, Маскоўскі пр-т, 33
Тэл. 37-33-79. Эл. пошта gazeta@vsu.by
Газета надрукавана афсетным спосабам ва УПП «Віцебская абласная друкарня»
ЛП 02330/116 ад 27.03.2014 г.
Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, Віцебск, 210015.
Падпісана да друку 28.04.2021 г. у 16.30. Тыраж 760
Аб'ём 2 друк. арк. Зак. 2028.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні неабавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.
Газета выходзіць адзін раз на месяц.

Галоўны рэдактар В.В. БАГАТЫРОВА
Рэдактар А.А. ДУБРОЎСКАЯ